*Литература*

1. *Халиль, И. Социально-экономические факторы, влияющие на формирование объемно-планировочной структуры малоэтажной жилой застройки в Сирии / И. Халиль [Электронный ресурс] // Вестн. Российского Уни-та Дружбы Народов. Серия «Инженерные Исследования» // – 2016. – №4. – С.115-120. – Режим доступа: http://journals.rudn.ru/engineering-researches/article/view/15331/14095 52. Халиль И.*
2. *Доклад генерального комиссара Ближневосточного агентства ООН для помощи беженцам и организации работ в Сирии 2014*
3. *Джабур, Саад-Аллах. Стихийное жильё в г. Дамаске в настоящее время / Саад-Аллах Джабур. – Дамаск : изд. конференции высшего научного совета, 2002.*

УДК 72.04+726.5.052

Ю. Т. Шэстак,
старшы выкладчык,
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

## ДЗВЕРЫ З НАДПІСАМІ Ў БЕЛАРУСКАЙ АРХІТЭКТУРЫ
## DOORS WITH INSCRIPTIONS IN THE BELARUSIAN ARCHITECTURE

Анатацыя: мэтаю працы з’яўляецца вывучэнне традыцыі выкарыстання надпісаў у афармленні ўваходаў у архітэктуры Беларусі, пачынаючы з канца XVI ст. Разглядаюцца выкананыя рознымі спосабамі прыклады размяшчэння інскрыпцый на палатне або раме дзвярэй, партале ці непасрэдна над праёмам. Прыводзіцца пераклад надпісаў на беларускую мову.

Abstract: The objective of this article is to present research of the historical practice of using inscriptions for decorating entrances in the architecture of Belarus since the 16th century. It considers such examples of texts, executed in different ways with the use of different materials and placed on the front side of door leaves, on door frames, on portals or above doorways. The article provides Belarusian translations of the most part of inscriptions.

Ключавыя словы: дзверы, надпісы, дэкор, запаўненні, праём, партал, гісторыя архітэктуры
Keywords: doors, inscriptions, decor, fillings, openings, portal, history of architecture

Практыка нанясення надпісаў на дзверы і выкарыстання ў аздобе галоўных парталаў мае працяглую традыцыю ў беларускім дойлідстве. Як з’ява гэта лагічна звязана з размяшчэннем дзвярэй на ўваходзе ў будынак – там, куды абавязкова падыдзе чалавек і зможа ўбачыць знакавае з той ці іншай прычыны паведамленне. Часцей за ўсё, такім аказваўся год сканчэння пабудовы – завяршэнне важнага этапа ў жыцці грамады і захаванне памяці пра яго. У нашых суседзяў захаваліся сярэднявечныя і рэнесансавыя прыклады пазнакі года на дзвярах касцёлаў (напрыклад, польскія храмы ў Ловічу, Радаме і інш.). Акрамя датаў у інскрыпцыях выкарыстоўваліся літарныя абрэвіяцыі, звычайна як шматкроць паўтораны арнаментальны элемент: манархічная каранаваная «R» на галоўных дзвярах Вавельскага кафедральнага касцёла (XIV ст.), абрэвіятура «SA» на двярах храма Св. Ганны (каля 1500 г.).

Самы ранні вядомы на тэрыторыі Беларусі прыклад ужывання інскрыпцый на ўваходах – гэта мармуровыя табліцы з надпісамі ў афармленні ўваходных парталаў Нясвіжскага замка. Над галоўным уваходам на шыльдзе, якая відавочна раней была часткай аблямоўкі дзвярэй, размяшчаецца ўрачыстае сведчанне пра закладку падмуркаў замка: «Мікалай Крыштаф Радзівіл князь на Алыцы і ў Нясвіжы граф у Шыдлаўцы, Міры і Крожах, князь Святой Рымскай Імперыі, ерусалімскі кавалер пасля шматлікіх працаў, якія ён вынес дзеля дзяржавы пры Жыгімонце Аўгусце, Генрыку і Стэфане, першых каралях, як у час міру гэтак і на вайне, каб засведчыць сваю любоў да роднага дому у час пілігрымкі да Святой Зямлі, учыненай паводле абету, сам будучы адсутным, заклаў першыя падмуркі гэтага замка у год ад нараджэння

Збаўцы 1583, 7 мая.» (пераклад А.Жлуткі). На шыльдах астатніх парталаў пададзеныя цытаты з Вульгаты (лацінскі пераклад Святога пісання, які з XVI ст. з’яўляецца афіцыйнай лацінскай Бібліяй каталіцкай царквы) з некаторымі скажэннямі. Напрыклад: «SI [E]SURIT INIMICUS [T]UUS CIBA ILLUM / PROVERB [XXV]» («калі галадае вораг твой, накармі яго / Пр. 25» (пераклад А. Жлуткі) (мал. 1).



Мал. 1. Шыльды над уваходамі падчас рэстаўрацыі Нясвіжскага замка

Адпаведна класічнаму канону, як у вышэй прыведзеным выпадку, інскрыпцыі можна было сустрэць менавіта на парталах. Паводле праекта пераробак ружанскага касцёла ў другой палове XVIII ст. над галоўным уваходам Я.С. Бекер меркаваў размясціць кансекрацыйную дату – 1617 г. У 1642 г. у Гродне будуецца касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі з кляштарам брыгітак, помнік архітэктуры ранняга барока з элементамі готыкі і рэнесансу. На партале з вуліцы напісаная дата завяршэння: «ANNO 1642» («З 1642 г.»). Над іншым уваходам – герб і, верагодна, ініцыялы фундатараў і заснавальнікаў кляштара – Весялоўскіх: «C W/ M W / W X/ L». Мемарыяльная шыльда ў пластычным партале дзятлаўскага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, помніка архітэктуры ранняга барока з рысамі рэнесансу, сведчыць пра фундацыю Сапегамі і сканчэнне будаўніцтва ў1646 г. Своеасаблівую пазнейшую трансфармацыю табліцы партала ў XIX ст. можна бачыць у буйным надпісе над ўваходам у могілкавую капліцу ў Косаве: «A D/ MDCCCLIX» («А[д нараджэння] Г[оспада] / 1859 г.».

Жалезныя дзверы сінагогі Старога Быхава (паб. пасля 1648 г.), судзячы па захаваных фотаздымках, уяўлялі з сябе сапраўдны мастацкі твор, дзе раннебарочныя рысы спалучыліся з нацыянальнымі габрэйскім матывамі [1, с. 95, 101]. У цэлым, архітэктура дзвярэй пераймае структуру дэкаратыўнага прадмета рэлігійнага культа, т.зв. «тасы», дзе ў цэнтры звычайна падпісваліся імёны фундатараў. На дзвярах у картушы вылучаны надпіс: «гэта міласціна [ахвяраванне] пана Аўраама сына праведнага [*або* – сына равіна]| Йосефа і яго жонкі Юты| дачкі настаўніка нашага Ісера ды будзе дабраславёная яго памяць» (пераклад Л. Смілавіцкага і М. Райхінштейна). Пад шыльдай можна ўбачыць лацінскія літары «IAN», якія, магчыма, былі звязаны з імём князя Яна Сапегі, якому належаў Быхаў, або рамесніка-каваля.

У нартэксе касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў Ружанах экспануюцца драўляныя дзверы з датаваным тэкстам, які выразаўся «ад дня Троіцы 1668 г. да 26 красавіка 1669 г». На паверхні аверса на вышыню ўсёй ніжняй паловы правай створкі размяшчаецца сапраўдны твор рэлігійнай паэтыкі XVII ст.: 81 радок, прысвечаны Панне Марыі і яе заступніцтву [2].

У аздобе двух уваходаў у драўляную Свята-Траецкую царкву праваслаўнага Маркава манастыра ў Віцебску (паб. да 1690 г.) выкарыстоўваюцца радкі кірыліцай і лацінай: «Дом гэты збудаваны ў гонар сьвятой Тройцы. Року 1690, мая 8». А ў пісьмовых крыніцах сустракаюцца звесткі пра заходнія падвойныя дзверы з лацінскімі літарамі «K.O.M. X.P. », дзе X.P. – манаграма Хрыста, а K.O.M. можа быць звязана з імём фундатара Караля Сымона Агінскага [3, с. 85, 86].

Яшчэ адным вартым увагі варыянтам ужывання надпісаў у аздабленні дзвярэй можна лічыць размяшчэнне іх у жывапісе з унутранай часткі будынка. Такі прыклад ёсць у Лідзе, дзе ў мураваным Фарным касцёле (1747–1770 гг.) ў фрэсках над дзвярыма з боку інтэр’ера, пад

хорамі, напісаны ў картушы год заснавання каталіцкай парафіі. Аднак, гэты надпіс хаця і дапасаваны да агульнага вырашэння ўваходнай групы, ўсё ж адрываецца ад дзвярнога праёма, у адрозненне, напрыклад, ад выпадку з мураванай Вялікай сінагогай (помнік архітэктуры барока 1642 г.) у Слоніме. У 2021 г. была скончана тэарэтычная рэканструкцыя інтэр'ераў, прадстаўленая творчай майстэрняй «Басталія» на падставе ўласных натурных вышукванняў 1991–1993 гг. і фотадакументаў 30-х гг. XX ст. Сярод шматлікіх фрэсак вылучаецца цытата з Торы, размеркаваная па арцы архівольта над уваходам.

У адрозненне ад выпадкаў з мураванымі будынкамі, калі месца нават непасрэдна над дзвярыма можа з'яўляцца толькі дэталлю вонкавага аздаблення, надпісы на шапцы (верхнім вушаку) праёма ў драўляных будынках апынаюцца часткай дэкора канструктыўнага элемента самога сталярнага вырабу. Такі прыклад быў у зруйнаванай у 2015 г. уніяцкай драўлянай царкве на могілках у в. Найдзёнавічы Стаўбцоўскага раёна. На шапцы дзвярэй з сярэдзіны на светла-жоўтай драўніне сурыкам было напісана: «Poswięcona ta Cerkiew R[ok]u 1777 26 8bra» («Асвечаная тая царква году 1777, 26 кастрычніка») (мал. 2). На вушаку над уваходам у драўляную званіцу ў Шэрашаве Пружанскага раёна можна ўбачыць фіксацыю даты збудавання: «ROKU 1799 MCA IULIA DИIA 21» («Году 1799 месяца ліпеня дня 21»).



Мал. 2. Вушакі ў Найдзёнавічах (фота А.В. Яроменкі) і Шэрашаве (фота С.А. Сергачова)

Даты на ўваходах працягваюць выкарыстоўваць і ў XX ст. У драўляным касцёле Св. Станіслава (1936 г.) ў в. Далёкія Браслаўскага раёна да касметычнага рамонта 2019 г. на некаторых дзвярах можна было знайсці пазнакі «1935», «1936». Надпісы такога кшталту, калі мемарыялізуецца толькі дата падзеі, звязанай з будынкам, з цягам часу ператвараюцца ў важную крыніцу гістарычнай інфармацыі, знітаваную з гісторыяй усяго паселішча або з жыццём асобна ўзятай сям'і. Прыкладам апошняга з'яўлюцца дзверы драўлянага свірана ў в. Бешанкі Іўеўскага раёна, дзе на дзвярным палатне выразана дата «1901. V». У цэнтры дзвярэй іншага свірана, у в. Яськавічы Лідскага раёна, зафіксаваны час будаўніцтва «1945». На жалезных двухстворкавых дзвярах у падвал жылога дома па вул. Ракаўская, 18 у Мінску былі выкаваны год узвядзення і, верагодна, ініцыялы ўласніка будынка: «18 / 92 / М. / Ш».

Сёння выкарыстанне інскрыпцый на дзвярах набыло ўтылітарны сэнс паведамлення пра функцыю, абмежаванні допуска, часы працы ўстаноў і г.д. Размяшчэнне такіх надпісаў можа быць зусім не ўвязана з дэкорам дзвярнога вырабу. Аднак нават у гэтым выпадку знаходзяцца прыклады імкнення дапасаваць тэкставае паведамленне да агульнага рашэння архітэктурнай дэталі, або, прынамсі, не ствараць дысананса з ім. Так гэта зроблена ў будынках Парка-музею інтэрактыўнай гісторыі «Сула», створанага ў наш час на месцы сядзібы Ленскіх (XVIII–XIX стст.). Тамсама, ў былых гаспадарчых пабудовах, дзе цяпер знаходзяцца гатэль і заля для мерапрыемстваў («Гасподня», «Каралеўская асамблея»), на шкляных уваходных дзвярах вылучылі «АД ЧАСУ 1590», што не звязана наўпрост з наяўнымі будынкамі, але мае важную сэнсавую нагрузку – падкрэсліць старажытнасць гісторыі месца і стварыць адчуванне пераемнасці з сучаснасцю.

Разгледжаныя ў артыкуле прыклады дэманструюць доўгую традыцыю выкарыстання надпісаў у дэкоры ўваходаў ў Беларусі: ад канца XVI ст. і да нашых дзён. Большасць вядомых нам дзвярэй і парталаў з інскрыпцыямі датуецца XVII–XVIII стст. і ствараецца ў перыяд

панавання барока, адпавядаючы характэрнаму для стыля памкненню да наслайвання значэнняў, выказвання адначасова ў сэнсавых і пластычных формах. Абсалютная большасць прыкладаў належыць да сакральнай архітэктуры. У XX ст. пашыраюцца выпадкі нанясення надпісаў на дзверы свецкіх будынкаў. Інскрыпцыі часцей за ўсё атрымлівалі не толькі інфармацыйны, але і мастацкі сэнсы, маглі выступаць у якасці галоўнага дэкаратыўнага элемента партала або створкі. Надпісы на ўваходах адрозніваліся па памерах і па сэнсавым насычэнні. Звычайна гэта былі мемарыяльныя інскрыпцыі, якія фіксавалі дату важнай падзеі, наўпрост ці апасродкавана звязанай з будынкам. Часцей за ўсё, гэта год будаўніцтва.

*Літаратура*

1. *Кукуня, В. Сінагогі Беларусі. Інвентарызацыйныя матэрыялы 1945–1949 гг. / В. Кукуня // Бюлетэнь маніторынгу гістарычнай прасторы – 2016. – № 1. – С. 94–149.*
2. *Шэстак, Ю. Т. Дзверы з надпісамі XVII ст. у касцеле ў Ружанах / Ю. Т. Шэстак, А. В. Яроменка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 9. – С. 24–32.*
3. *Габрусь, Т. В. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя, М. А. Ткачоў. – Мн. : Беларусь, 2003. – 351 с.*


УДК 711:[314+338]

A. Kuśmierska
Politechnika Krakowska, Polska

## WYKORZYSTANIE ENERGII SŁONECZNEJ W OBIEKTACH ARCHITEKTONICZNYCH OŚRODKÓW JEŹDZIECKICH
## THE USE OF SOLAR ENERGY IN THE ARCHITECTURAL STRUCTURES OF EQUESTRIAN CENTERS

Abstrakt: Artykuł poświęcony jest problemom związanym z zasilaniem w energię elektryczną ośrodków jeździeckich. Autorka, po przeprowadzonych badaniach, stara się odpowiedzieć na pytanie czy możliwe jest całkowite zastąpienie konwencjonalnego zasilania obiektów hippicznych poprzez energię uzyskaną z paneli fotowoltaicznych. Analiza prowadzona jest na podstawie modelowego ośrodka jeździeckiego.
Słowa kluczowe: architektura hippiczna, ośrodki jeździeckie, panele fotowoltaiczne, energia słoneczna, ochrona środowiska naturalnego
Abstract: This article looks at the problems related to energy supply in equestrian centres. The author, after conducting research answers the question whether it is possible to fully replace conventional power supply with the use of photovoltaic panels. The analysis has been conducted based on model equestrian centre.
Key words: hippic architecture, equestrian centres, PV panels, solar energy, natural environment protection.

**Wprowadzenie.** Problematyka zasilania ośrodków jeździeckich w energię odnawialną w kontekście szerokiego chronienia naszego środowiska naturalnego ma wszechstronne uzasadnienie. W sytuacji oznak kryzysu energetycznego na świecie i kurczących się zasobów konwencjonalnych źródeł energii, jak też niepokojących symptomów wskazujących na zmiany klimatu na Ziemi – – czego przyczyną między innymi są procesy spalania: kopalin, ropy i gazu ziemnego itp. Problem emisji szkodliwych substancji do atmosfery szczególnie jaskrawo pokazany został na forum ogólnoświatowym w Rio de Janeiro w 1992 roku, na pierwszej w historii globalnej konferencji środowiskowej, zwanej potocznie Szczytem Ziemi. Polska od początku włączyła się intensywnie w akcję mającą na celu eliminowanie skutków produkcji gazów emisyjnych. Jest to problem bardzo aktualny w Polsce i na świecie, dlatego nadmienić wypada, że Polska w tym względzie odgrywa